(засваенне пэўных сацыяльных і культурных характарыстык). Такая ідэнтыфікацыя фарміруецца паступова, развіваецца і найбольш выразна усведамляецца і заўважаецца пры сутыкненні з чужой культурай, напр., у мультыкультурных школах і дзіцячых садках. У гэтым зрэзе канфрантуем культурную ідэнтычнасць у беларускім кантэксце паводле інтэрпрэтацыі “беларускасці” ў чэшскім (Й. Боўзек) і славацкім кантэксце (І. Сліўкова).

**4. Стэрэатып** становіцца прыладай інтэрпрэтацыі свету, на падставе чаго мы затым фарміруем погляды і меркаванні.У значнай меры гэта паняцце прымяняецца ў міжкультурнай камунікацыі, псіхалогіі, лінгвакультуралогіі, а таксама, дзякуючы ім, спрашчае і вытлумачвае ўспрыняцце чужой культуры ў рамках культурных ці моўных даследаванняў. Многія **нацыянальныя стэрэатыпы** сталі настолькі ўстойлівай часткай культуры, што іх пазіцыя прыраўноўваецца да пазіцыі фальклору. Нашай мэтай з’яўляецца высветліць, якімі культурнымі стандартамі характарызуецца беларуская культура.

УДК 371.262.6:821.161.3:929

І.В. Мышкавец
(Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Мінск)

## АТЭСТАТЫ СТАЛАСЦІ ЯК КРЫНІЦА ІНФАРМАЦЫІ ПРА МАКСІМА БАГДАНОВІЧА І ЯГО АДНАКЛАСНІКАЎ

Творчая спадчына Максіма Багдановіча, генія беларускай літаратуры, адносіцца да ліку самых каштоўных збораў нацыянальнай культуры, з’яўляецца неад’емнай часткаю сусветнай духоўнай культуры. Вывучэннем жыццёвага і творчага шляху пісьменніка займаюцца розныя навуковыя інстытуты, асобныя даследчыкі, а на працягу вось ужо 35 гадоў пошукавую і даследчую працу вядуць супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.

У кола інтарэсаў музейных супрацоўнікаў уваходзіць асоба М. Багдановіча, яго рукапісная спадчына і прыжыццёвыя публікацыі. Таксама навуковыя супрацоўнікі займаюцца пошукам інфармацыі пра бацькоў паэта, яго родных, блізкіх, сяброў, аднакласнікаў, калег. Гэтая інфармацыя дапамагае асэнсаваць час, у які жыў і тварыў М. Багдановіч, знайсці вытокі яго творчасці, вылучыць шляхі далейшых пошукаў артэфактаў, звязаных з асобай пісьменніка.

У Дзяржаўным архіве Яраслаўскай вобласці захоўваюцца матэрыялы, якія могуць праліць святло на тыя ці іншыя аспекты жыцця М. Багдановіча. Для даследчыкаў творчасці беларускага

пісьменніка найбольш цікавымі падаюцца наступныя фонды: “Яраслаўская мужчынская гімназія імя Аляксандра I” (фонд 557), “Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй” (фонд 571), “Сялянскі Пазямельны банк” (фонд 516).

Вядома, што Максім Багдановіч скончыў гімназію ў 1911 годзе. Ціхан Годнеў, адзін з аднакласнікаў беларускага паэта, ва ўспамінах пісаў, што “самымі бліжэйшымі яго (М. Багдановіча – І.М.) сябрамі ў класе былі гімназісты Дзябольскі, Арлеанскі і Ушакоў”. Асоба Дзіядора Дзябольскага добра вядома беларускім даследчыкам творчасці паэта, пра двух іншых узгаданых сяброў М. Багдановіча да нядаўняга часу не было вядома ніякай інфармацыі (толькі прозвішчы). А.Я. Багдановіч у сваіх успамінах называе толькі аднаго аднакласніка сына па Яраслаўскай мужчынскай гімназіі – Дзіядора Дзябольскага. Беларускім даследчыкам удалося адшукаць Дз. Дзябольскага, атрымаць ад яго каштоўныя ўспаміны, у якіх называюцца імёны яшчэ некалькіх аднакласнікаў М.Багдановіча (Мікалай Какуеў, Іван Лілееў).

Сярод атэстатаў сталасці, якія захоўваюцца ў архіве, ёсць дакумент выпісаны на імя Арлеанскага, сябра М. Багдановіча. У дакуменце, акрамя прозвішча, утрымліваецца іншая інфармацыя: Арлеанскі (Орлеанский) Сяргей Уладзіміравіч, сын надворнага саветніка, праваслаўнага веравызнання. Нарадзіўся ў г. Варнавіна Кастрамской губерні 20 чэрвеня 1889 года, у жніўні 1905 года залічаны ў Яраслаўскую мужчынскую гімназію імя Аляксандра I, скончыў яе (як і М. Багдановіч) 1 чэрвеня 1911 года. Пры выдатных паводзінах атрымаў наступныя балы: чатыры (філасофская прапедэўтыка, матэматыка, фізіка) тры (па ўсіх астатніх прадметах). Дадзеныя звесткі, асабліва імя, імя па бацьку, дата і месца нараджэння, паходжанне, з’яўляюцца вельмі каштоўнымі. Яны дазваляюць весці актыўныя пошукі інфармацыі пра Уладзіміра Арлеанскага, а таксама пра яго нашчадкаў, у якіх могуць захоўвацца сямейныя архівы, фотаздымкі, рэчы, дакументы і г. д.

На жаль, пра другога аднакласніка і лепшага сябра Максіма Багдановіча, якога называе ва ўспамінах Ціхан Годнеў, інфармацыі няма. Атэстат сталасці адсутнічае, гэта можа сведчыць пра тое, што гімназіст Ушакоў застаўся на другі год і скончыў гімназію пазней, чым М. Багдановіч, сябра мог кінуць вучобу і не атрымаў атэстата сталасці. Аднакласнік паэта мог пераехаць у іншы горад, працягваць навучанне ў іншай установе адукацыі.

Ёсць яшчэ адна версія, якая не тычыцца самога гімназіста Ушакова, а адносіцца да аўтара ўспамінаў пра М. Багдановіча. Матэрыял Ціхана Годнева з’явіліся ў друку праз пяцьдзесят пяць

гадоў пасля заканчэння ім гімназіі. Першая публікацыя – у часопісе “Маладосць”, пазначана “Літаратурны запіс Н. Ватацы”, таму мог памыліцца Ц. Годнеў, называючы прозвішча аднакласніка, альбо Н. Ватацы пры апрацоўцы матэрыялаў (у спісе ёсць падобнае па гучанні прозвішча “Паўлушкоў”). Магчымы і іншыя прычыны адсутнасці атэстата сталасці Ушакова ў Дзяржаўным архіве Яраслаўскай вобласці.

Вельмі каштоўнай з’яўляецца інфармацыя, якая захоўваецца ў атэстатах сталасці гімназістаў Яраслаўскай мужчынскай гімназіі імя Аляксандра І. Усяго ў справе 557 Дзяржаўнага архіва Яраслаўскай вобласці захоўваюцца 69 атэстатаў выпускнікоў 1911 года. Гэтыя дакументы давалі гімназістам права паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Расійскай імперыі, а для музейных супрацоўнікаў яны выступаюць як гістарычная крыніца, якая ўтрымлівае шмат інфармацыі. Можна вызначыць наступныя важныя пазіцыі: прозвішча, імя, імя па бацьку; паходжанне; веравызнанне; месца нараджэння; дата нараджэння; дата паступлення ў гімназію; дата заканчэння гімназіі; паводзіны; вучэбныя прадметы і балы; поспехі ў асобных навуках; узнагароджанне медалём; подпісы адказных асоб; нумар і дата выдачы дакумента.

Атэстат сталасці – гэта юрыдычны дакумент, які сведчыць, што яго ўладальнік праслухаў поўны курс навук у гімназіі, паспяхова здаў выпускныя экзамены і мае права паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову. Гэты дакумент выконвае некалькі важных функцый, у тым ліку прававую, сацыяльную, інфармацыйную, культурную.

Для музейнага супрацоўніка, даследчыка на першы план выходзіць іншая функцыя атэстата сталасці, ён выступае як важная гістарычная крыніца. Вывучаючы атэстаты сталасці выпускнікоў Яраслаўскай мужчынскай гімназіі 1911 года, мы знаходзім інфармацыю пра Максіма Багдановіча, яго сяброў, аднакласнікаў. Звесткі з атэстатаў сталасці пра паходжанне, дату і месца нараджэння могуць дапамагчы ў пошуку аднакласнікаў беларускага паэта і ідэнтыфікацыі іх.

УДК 821.161.3:821.521

Кэн Сібата (Універсітэта Васэда, Токіа, Японія)

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ ПА-ЯПОНСКУ

Максім Багдановіч – класік беларускай літаратуры і «пясняр чыстай красы». На жаль, пераклады яго вершаў на японскую мову пакуль не былі надрукаваныя, нягледзячы на іх важнасць у сусветнай літаратуры. Абставіны майго даследчага жыцця скаладіся так, што ўжо